**3** Адкрыйце малюнак з задання 4 пасля § 6 (с. 49).



Выканайце павароты і адлюстраванні зыходнага відарыса ў адпаведнасці з дадзенымі ніжэй узорамі. Змяніце заліўку. Захавайце атрыманыя відарысы.



## § 8. Аперацыі над фрагментам відарыса

Для выканання многіх аперацый рэдагавання відарыса патрабуецца вылучаць частку выявы, прызначаную для рэдагавання.

Вылучаную частку відарыса называюць **фрагментам відарыса**.

У графічным рэдактары Paint для вылучэння фрагмента відарыса выкарыстоўваюць інструмент **Выделить**.



Пстрычка мышы па стрэлцы ў ніжняй частцы інструмента **Выделить** разгортвае спіс

**Прыклад 8.1.** Вылучэнне прамавугольнай вобласці.



Пасля вылучэння вакол фрагмента відарыса з'яўляецца прамавугольная вобласць, абмежаваная штрыхавой лініяй. У яе вуглах і на сярэдзінах старон размяшчаюцца маркеры змянення памераў вылучанага фрагмента відарыса.

Правообладатель Народная асвета

**Прыклад 8.2.** Вылучэнне адвольнай вобласці.



Пасля вылучэння вобласць вылучэння набывае прамавугольную форму.



Усе аперацыі рэдагавання відарыса выконваюцца толькі ў дачыненні да вылучанай вобласці.

**Прыклад 8.3.** Перамяшчэнне вылучанага ў адвольную вобласць фрагмента.



Зыходны відарыс



Перамяшчэнне ў рэжыме празрыстага вылучэння



Перамяшчэнне ў рэжыме непразрыстага вылучэння

інструментаў для вылучэння фрагмента малюнка.

Формы вылучэння:

Прямоугольник — вылучэнне выконваецца аналагічна маляванню прамавугольніка (прыклад 8.1);

Произвольная форма — для вылучэння трэба абвесці контур фрагмента, утрымліваючы левую кнопку мышы, як пры рабоце з інструментам **Карандаш** (прыклад 8.2).

Параметры вылучэння:

Выбрать все — вылучэнне ўсяго відарыса;

Обратить выделение — вылучэнне часткі відарыса, размешчанай па-за вылучанай вобласцю;

Прозрачное выделение — вылучэнне без фону. Вобласці фрагмента з бягучым колерам фону стануць празрыстымі (прыклад 8.3).

Удалить — выдаленне вылучанага фрагмента.

Каб выканаць вылучэнне фрагмента відарыса, трэба:

1. Выбраць форму вылучэння.
2. Пераканацца, что Колер 2 адпавядае фону вылучанага фрагмента.
3. Вылучыць фрагмент відарыса.

Вылучаны фрагмент выявы можна выдаліць, націснуўшы клавішу Del.

Для перамяшчэння фрагмента трэба:

1. Навесці курсор на вылучаную вобласць. Выгляд паказальніка мышы зменіцца на ✥.

2. Перамясціць фрагмент, утрымліваючы левую кнопку мышы.

Каб атрымаць копію фрагмента, трэба перамяшчаць яго, утрымліваючы клавішу Ctrl.

Памер фрагмента відарыса можна змяніць з дапамогай маркераў змянення памеру. Паварот і адлюстраванне фрагмента выконваецца гэтак жа, як паварот і адлюстраванне ўсяго відарыса.

Для нахілу фрагмента відарыса трэба:

1. Пстрыкнуць па кнопцы .

2. У дыялогавым акне **Изменение размеров и наклона** ў вобласці **Скос** у палях **По горизонтали** і **По вертикали** ўвесці значэнні (у градусах) для нахілу вылучанай вобласці. Націснуць кнопку **OK**.

(Разгледзьце прыклад 8.4.)

Фрагмент відарыса ў графічным рэдактары Paint можна

**Прыклад 8.4.** Нахіл фрагмента відарыса.













Правообладатель Народная асвета

**Прыклад 8.5.** Выкананне аперацый **Вырезать, Копировать** і **Вставить.**

**1.** Выразаць (Капіраваць) фрагмент відарыса на першым малюнку.

| Выразанне | Капіраванне |
|---|---|
|  |  |
| Вырезать | Копировать |
|  |  |

**2.** Адкрыць другі малюнак у новым акне рэдактара і выканаць устаўку.

Вставить

Фрагмент відарыса будзе ўстаўлены ў верхні левы вугал.



**3.** Выканаць аперацыю перамяшчэння.



выразаць або скапіраваць пры дапамозе групы інструментаў меню **Изменить.**

**Буфер абмену** — спецыяльная вобласць памяці камп'ютара для часовага захоўвання даных пры выкананні аперацый **Вырезать** і **Копировать.**

Выразаны ці скапіраваны фрагмент відарыса можна шмат разоў размясціць на адным малюнку або ўставіць на новым малюнку, выкарыстаўшы інструмент Вставить .

Для выканання аперацый **Вырезать, Копировать, Вставить** зручна выкарыстоўваць камбінацыі клавіш клавіятуры («гарачыя клавішы»):

- Ctrl + X — выразаць;
- Ctrl + C — капіраваць;
- Ctrl + V — уставіць.

(Разгледзьце прыклад 8.5.)

Усе аперацыі з фрагментам відарыса можна выконваць праз кантэкставае меню, якое адкрываецца пстрычкай правай кнопкай мышы.

Калі неабходна пакінуць толькі частку малюнка, выкарыстоў-

ваюць інструмент **Обрезать** з групы **Изображение** на Панэлі інструментаў (прыклад 8.6).

Пасля прымянення гэтага інструмента на палатне застаецца толькі вылучаны фрагмент відарыса.

У графічным рэдактары Paint для Windows 11 з'явіўся новы інструмент **Удалить фон**. Ён размешчаны ў групе **Изображение** на Панэлі інструментаў. Для выдалення фону дастаткова выбраць гэты інструмент, і рэдактар аўтаматычна вызначыць аб'ект відарыса і выдаліць фон.

**Прыклад 8.6.** Выкарыстанне інструмента .





1. Што разумеюць пад фрагментам відарыса?
2. Якія існуюць формы вылучэння ў графічным рэдактары Paint?
3. Якія аперацыі можна выконваць над фрагментам відарыса?
4. Што такое буфер абмену?
5. Якія дзеянні трэба выканаць, каб абрэзаць відарыс?

## Практыкаванні

**1** Стварыце відарыс паводле ўзору (таўшчыня контуру — 1 піксель).



Правообладатель Народная асвета

| Этапы малявання | Інструменты і аперацыі | Настройкі колеру |
|---|---|---|
|  | Авал, утрымліваючы Shift | |
|  | Капіраваць, утрымліваючы Ctrl | — |
|  | Авал | |
|  | Трохвугольнік<br>Адлюстраваць па вертыкалі | |
|  | Лінія 135<br>Заліўка колерам | |
|  | Авал, утрымліваючы Shift | |
|  | Капіраваць з празрыстым вылучэннем<br>Адлюстраваць па гарызанталі<br>Перамясціць | |

Захавайце створаны відарыс.

**2** Стварыце відарыс.



| Этапы малявання | Інструменты і аперацыі | Настройкі колеру |
|---|---|---|
|  | Авал |  |
|  | Авал, утрымліваючы Shift. Капіраваць з празрыстым вылучэннем і перамясціць |  Таўшчыня контуру — 5 пікселяў. Пры капіраванні колер фону белы |
|  | Трохвугольнік Адлюстраваць па вертыкалі |  |
|  | Трохвугольнік Адлюстраваць па вертыкалі **Ластик** Перамясціць з празрыстым вылучэннем |  |

Правообладатель Народная асвета

| Этапы малявання | Інструменты і аперацыі | Настройкі колеру |
|---|---|---|
|  | Авал |  |
|  | Лінія<br>Капіраваць з празрыстым вылучэннем<br> Адлюстраваць па гарызанталі<br>Перамясціць |  |

Захавайце створаны відарыс.

**3** Стварыце відарыс, выкарыстаўшы малюнкі з прыкладу 8.5 (с. 58) і з задання 1.



**4** Адкрыйце файл з загатоўкамі фігур. Выкарыстаўшы аперацыі над фрагментамі, стварыце выявы паводле ўзораў.



Загатоўкі фігур





Узоры відарысаў

**5** Стварыце відарысы.





Захавайце атрыманыя відарысы.

**6*** Намалюйце пейзаж, выкарыстаўшы інструмент **Кисть** з рознымі эфектамі.



**7*** Дапоўніце пейзаж з задання 6 відарысамі з задання 5.



Захавайце змяненні ў файле.

**8** Падпішыце выкананую ў заданні 7 работу, выкарыстаўшы інструмент [A]. Захавайце змяненні ў файле.

Правообладатель Народная асвета